# Міністр прыняў удзел у першым дні выставы Bakutel-2016

Міністр сувязі і інфарматызацыі Папкоў Сяргей прыняў удзел у першым дні выставы Bakutel-2016

З 29 лістапада па 2 снежня 2016 года ў Баку (Азербайджанская Рэспубліка) праходзіць 22-я Азербайджанская Міжнародная выстава «Тэлекамунікацыі і інфармацыйныя тэхналогіі». Выстава Bakutel праводзіцца з 1995 года і за гэты час стала найбуйнейшым мерапрыемствам у галіне ІКТ у Каўказска-Каспійскім рэгіёне.

Паралельна з выставай пройдуць мерапрыемствы, накіраваныя на разгляд найбольш актуальных пытанняў у сферы ІКТ, сярод якіх цэнтральным мерапрыемствам стане канферэнцыя «Інтэрнэт рэчаў». На канферэнцыі запланавана выступленне Папкова С.П. з дакладам аб развіцці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у Рэспубліцы Беларусь.

У рамках Bakutel-2016 Міністр прыме ўдзел у 4-ым пасяджэнні Рабочай групы высокага ўзроўню па развіцці інфармацыйнага грамадства, якое арганізавана Рэгіянальнай садружнасцю ў галіне сувязі, і выступіць па пытаннях фарміравання і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў у Рэспубліцы Беларусь.

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/29-11-2016-1369*